

Склаў Юрый ФАЛІНСКІ, г. Мінск.

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ:
Па гарызанталі: Трал. Ствол. Фартух. Грэнка. Тэнар. Агарак. Алока. Раса. Ахапак. Асёл. Какава. Ар. Аблога. Абраза. **Па вертыкалі:** Лета. Сухар. Ластаўка. Форт. Снол. Грак. Эра. Гара. Рыс. Апала. Ошава. Ака. Алё. Лямка. Клас. Куль. Вага. Араб.

Філатэліст

БЕЛАРУСЬ—ПОЛЬШЧА

Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь выпусціла ў абарачэнне паштовую марку «25-годдзе ўсталявання дыпламатычных адносін паміж Рэспублікай Беларусь і Рэспублікай Польшча».

Яны, гэтыя дыпламатычныя адносіны, развіваюцца сёння ў палітычнай, эканамічнай, культурнай і навуковай сферах, а таксама ў сферы рэгіянальнага і трансгранічнага супрацоўніцтва. Намінал маркі «Н» адпавядае тарыфу на перасылку міжнароднай простай пісьмовай карэспандэнцыі (пісьмаў, бандэроляў, дробных пакетаў) масай да 20 г уключна непрыярытэтнай.

Песню бярыце з сабою

А дні прыгожыя...

Вось мы і дачакаліся вясны — пары абуджэння і росквіту, цяпла і святла, надзей і кахання. З гэтай нагоды прапануем цудоўную песню кампазітара Уладзіміра Будніка на вершы паэта Уладзіміра Карызны «А дні прыгожыя».

Першым выканаўцам гэтага твора ў далёкія 1970-я гады быў ансамбль «Верасы», і песня тады была вельмі папулярнай. Сёння яна таксама выконваецца маладымі спевакамі, гучыць па радыё. Гэта азначае, што яна патрэбная людзям.

Музыка Уладзіміра Будніка *Вершы Уладзіміра Карызны*



Як цяжка нам сказаць упершыню «люблю»,
Нібыта пакідаць збіраешся зямлю,
І ветры ўздымуцца, адкуль — і сам не знаеш,
Ты задыхаешся і ўжо іскрынкай таеш.
І хмары наплылі, і зорак не відаць
І што тады рабіць, і што тады казаць.

Прыпеў:
А дні прыгожыя нам зоркай яснай свецяць,
І шчаслівейшы ты на ўсім бялюткім свеце.
У яркай вышыні вачам прыемна сінь,
А ў сэрцы халадком гарачая вышынь.

Як цяжка ўпершыню парой неспадзяванай
На самай вышыні «бывай» сказаць каханню,
Спусціцца на зямлю, пакінуць зорны воз,
Зноў піць настой крыніц і гаркаватых лоз,
Надзеяцца, чакаць вясновых светлых дзён,
З усмешкай уздыхаць пад жоўтых лісцяў звон.
Прыпеў.

Рубрыку вядзе Уладзімір КАРЫЗНА

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.17	19.20	12.03
Віцебск —	7.07	19.09	12.02
Магілёў —	7.07	19.10	12.03
Гомель —	7.04	19.06	12.02
Гродна —	7.32	19.35	12.03
Брэст —	7.33	19.35	12.02

Месяц

Апошняя квадра 20 сакавіка. Месяц у сузор'і Стральца.

Імяніны

***Пр.** Іраіды, Андрыяна, Анісія, Давыда, Івана, Канстанціна, Конана, Марка, Фёдара, Яўлампія.*
***К.** Фаіны, Кірылы, Эдуарда.*

Фота Максіма ШАСТАКОВА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

— Аб'яўляю вас мужам і жонкай!

— Як мужам?! Ты ж казала, у кіно здымацца будзем!

Люблю чытаць гараскопы.

Гэта адзінае месца, дзе ў мяне ёсць грошы, вандроўкі і ідэальныя адносіны.

Падчас экзамену выкладчык кажа студэнту:

— Ну-с, галубок, перакажыце мяне, што вам не трэба ісці ў войска.

Мой кот жыве па прынцыпе: «есці надакучыла спаць».

І на працягу дня ставіць коску ў розных месцах.

Не тое страшна, што жонка ўвесь час глядзіць серыялы, а тое, што яна потым падрабязна пераказвае іх!

Дзеці — кветкі жыцця :)

Унучка за абедам пытаецца:

— Бабуля, а адкуль я ўзялася?

— Цябе мама ў краме купіла.

— А маму хто купіў?

— Я.

— Лепш бы ты, бабуля, пернікаў купіла!

Малюнак Аляксандра КАРШАКЕВІЧА.

Даты Падзеі Людзі

18 САКАВІКА

1633 год — у грамаце караля Уладзіслава IV Вазы ўпершыню згадана друкарня ў Мінску пры манастыры святых Пятра і Паўла «для друкавання кніг і ўшанавання ў іх людзей годных, як духоўных, так і свецкіх».

1875 год — нарадзіўся (Ковенская губерня) Марцін Міхайлавіч Кухта, беларускі друкар, кнігавыдавец. У 1906 годзе ў Вільні заснаваў друкарню з правам выдаваць кнігі, газеты і часопісы на еўрапейскіх мовах. У яго друкарні выйшлі першы нумар беларускай газеты «Наша ніва», творы Ф. Багушэвіча, М. Багдановіча, Я. Коласа, Цёткі і іншых беларускіх пісьменнікаў, забароненыя цэнзурай творы.

1921 год — падпісаны Рыжскі мірны дагавор аб спыненні вайны і нармалізацыі адносін з Польшчай. Дагавор заключаны паміж РСФСР (упаўнаважана і ўрадам БССР), УССР і Польшчай. Паводле яго, Заходняя Беларусь і Заходняя Украіна адышлі да Польшчы. У складзе БССР засталося 6 паветаў Мінскай губерні — Бабруйскі, Барысаўскі, Ігуменскі, Мазырскі, Мінскі і Слуцкі.



1923 год — нарадзіўся (г. Мінск) Захар Захаравіч Гало, удзельнік Мінскага патрыятычнага падполля ў Вялікую Айчынную вайну. З восені 1941 года працаваў сакратаром бюро пропускаў Мінскай гарадской управы. Забяспечваў падпольшчыкаў бланкамі дакументаў. Быў звязаны з падпольнымі групамі на чыгуначным вузле. Узначальваў дыверсійную групу, якая ў ліпені—верасні 1943 года замініравала 6 варожых эшалонаў, што ішлі на фронт. Перапраўляў зброю і боепрыпасы ў партызанскі атрад імя Суворава брыгады «Народныя мсціўцы». Актыўна ўдзельнічаў у выратаванні ваеннапалонных і адпраўцы іх у партызанскія атрады. Восенню 1943 года арыштаваны гітлераўцамі і расстраляны ў лютым 1944 года.

1935 год — нарадзіўся (в. Селішча, цяпер у Навагрудскім раёне) Аляксандр Мікалаевіч Булыка, беларускі вучоны, доктар філалагічных навук, прафесар, член-карэспандэнт НАН Беларусі. Ім распрацаваны пытанні гістарычнай лексікалогіі беларускай мовы, старабеларускай фанетыкі, марфалогіі і арфаграфіі, асаблівасці мовы выданняў Ф. Скарыны. Аўтар больш як 300 навуковых прац, у тым ліку 10 манаграфій, аўтар і суаўтар 17 слоўнікаў. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі.

Было сказана

Паўлюк ТРУС, паэт:
«Там, дзе ў бурах
Сыпалася зерне,
Бур'янам дзікім
Шлях не зарасце».

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 1072.
Нумар падпісаны ў 19.30 17 сакавіка 2017 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12